Аляксандраў С.

# ШЛЯХ ДА ПОДЗВІГУ

Герой гэтага нарыса Сцяпан Аляксандравіч Лавянецкі нарадзіўся 26.10.1923 г. у в. Філатава Круглянскага раёна. З 1942 служыў у Чырвонай Арміі, механік-вадзіцель самаходнай артылерыйскай установкі. Сяржант Лавянецкі вызначыўся 24.10.1944 г. у баях за горад Надзькала (Венгрыя), дзе і загінуў. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (28.4.1945). Яго імем названы вуліцы ў г. Таліца Екацярынбургскай вобл., у г. Волагдзе, на радзіме пастаўлены помнікі.

Валагодскі ваенны камісар, стомлены і знерваваны ваенны, падняў галаву ад папер, калі хтосьці пераступіў парог яго кабінета. Да стала падыходзіў юнак гадоў семнаццаці.

– Вось, прынёс заяву, – ціха прамовіў ён і працягнуў ваенкому лісток

Той узяў, прачытаў. Патрымаў у руцэ і працягнуў назад юнаку.

– Не, Сцяпан Аляксандравіч, – прамовіў ён стомлена, – вам яшчэ рана ў армію.

– Я ж добраахвотнікам, – сказаў юнак з добра прыкметным беларускім акцэнтам. – А добраахвотнікам можна брацць і ў мае гады.

– Не, дарагі таварыш Лавянецкі, нельга браць. Табе сказалі няпраўду. У арміі ў твае гады пакуль рабіць няма чаго. Хочаш дапамагаць фронту – працуй ударна тут, у тыле. Гэта будзе самае лепшае.

Сцяпан Лавянецкі выйшаў з кабінета ваенкома. Засмучаны няўдачай, ён ішоў па вуліцах Волагды і ўспамінаў мірныя дні. Як добра было вучыцца, бегаць з таварышамі на рэчку, каб пакупацца, паваляцца на пяску, пабегаць. Любіў Сцяпан вудзіць рыбу. Бывала, збярэцца з таварышамі і на світанні адправіцца на раку. Выберуць ціхае месца, і пакуль узыдзе сонца, наловяць рыбы не толькі на юшку. З уловам Сцёпа бег таропка дадому, каб парадаваць маці. Казіміра Феліксаўна на парозе сустракала сына, забірала рыбу і спяшалася на кухню, каб прыгатаваць сняданне.

Цяпер гэта жыццё здавалася далёкім, быццам мінула многа-многа гадоў. А прайшло ўсяго некалькі месяцаў... Але як яны ўсё змянілі.

Казіміра Феліксаўна ні аб чым не стала пытацца ў Сцяпана, калі той вярнуўся дамоў. Разумела – сам раскажа, толькі трэба даць яму час супакоіцца, падумаць. Маці добра ведала характар сына. І ён усё расказаў. Казіміра Феліксаўна параіла пайсці на работу. Так Сцяпан стаў працаваць грузчыкам, а вечарамі вучыўся на шафёра. Марыў, калі прыйдзе час прызыву ў армію, яго пашлюць на фронт шафёрам. Але ваеннае начальства рашыла інакш.

Сцяпан Лавянецкі быў прызваны ў армію ў 1942 годзе і пасланы на курсы механікаў-вадзіцеляў самаходных артылерыйскіх установак. Паспяхова іх закончыў. За смеласць у баях на Закаўказскім фронце Лавянецкі быў узнагароджаны медалём "За адвагу". Другую сваю ўзнагароду – ордэн Айчыннай вайны II ступені – Сцяпан атрымаў за храбрасць, якую праявіў у баях за вызваленне Брэста. Цяжкія кіламетры франтавых дарог, убачанае людское гора заставіла Сцяпана па-іншаму глянуць на тую зямлю, дзе жылі яго бацькі, дзе ён сам убачыў свет.

Канец кастрычніка 1944 года. Венгрыя. Конна-механізаваная група генерал-лейтэнанта І. А. Пліева выйшла на шляхі адыходу 8-й нямецкай арміі і падверглася моцнаму контрудару праціўніка, аказаўшыся ў цяжкім становішчы. Пачаліся баі ў акружэнні. Яны не заціхалі ні на гадзіну пяць дзён і начэй. Такога напружання бою яшчэ не прыходзілася бачыць. Сяржант Лавянецкі добра помніў, як цяжка было пад Варшавай. Тады ўстаноўка была падбіта і ўвесь экіпаж мог загінуць. Але Сцяпан здолеў не толькі сам выбрацца з самаходкі, якая гарэла. Пад агнём ворага ён вынес усіх членаў экіпажа ў бяспечнае месца.

Тут жа, пад венгерскім горадам Надзькала, нічога не было бачна з-за варожых танкаў: яны суцэльнай сцяной ішлі на пазіцыі палка.

24 кастрычніка на паўднёвай ускраіне горада ў складаным становішчы апынуўся ўзвод танкаў Т-34. Кампалка Турчын кінуў ім на дапамогу некалькі самаходных установак, сярод якіх была і машына сяржанта Лавянецкага. Адбыўся гарачы бой дзвюх танкавых груп. У першыя ж мінуты бою экіпаж самаходкі Лавянецкага падбіў варожы танк.

Сцяпан Лавянецкі, уважліва назіраючы за полем бою, вёў сваю ўстаноўку па-майстэрску.

– Сцёпа, Сцёпа, – пачуў ён голас камандзіра машыны, – зманеўруй.

Вадзіцель адразу зразумеў, што трэба зрабіць: установка развярнулася так, што варожы танк апынуўся пад прамым ударам. А наводчык у экіпажы быў майстрам сваёй справы. Яму спатрэбіўся толькі адзін снарад, каб трапіць у цэль.

"Тыгра", які з'явіўся з-за падбітага танка, Лавянецкі заўважыў першы.

– Камандзір, "тыгр"! – крыкнуў сяржант у перагаворнае ўстройства.

– Мы яго пачастуем, – адазваўся камандзір. І з яго апошнім словам снарад дакладна трапіў у танк. Рухацца "тыгр" ужо не мог, але агрызаўся агнём.

– Даб'ем? – спытаў Лавянецкі камандзіра.

– Давай уперад, – адказаў той, і Сцяпан накіраваў установку на збліжэнне з "тыграм". Але іменна ў гэты момант цяжкі снарад ударыў у самаходку. На дапамогу экіпажу прыйшоў камандзір танкавага ўзвода. Ён падвёў сваю "трыццацьчацвёрку" бліжэй да падбітай установкі. Лавянецкі дапамог выбрацца камандзіру, а потым стаў выбірацца сам.

Ён схапіўся рукамі за верхні люк, але стаць на ногі не змог. Цела абмякла, і ён упаў на зямлю.

Два дні не дажыў Сцяпан да свайго дня нараджэння.

28 красавіка 1945 года быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза воінам, якія вызначыліся ў баях за Венгрыю. Было ў тым Указе і прозвішча сяржанта С. А. Лавянецкага.

**Аляксандраў, С. Шлях да подзвігу / С. Аляксандраў // Памяць : Круглянскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш.]. — Мінск, 1996. — С. 352—354.**